ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 14 Нядзеля, 19 лістапада 1944 г.

Цяпер, калі Айчынная вайна ідзе да пабеданоснага канца, ва ўсёй велічы ўстае гістарычная роля совецкага народа. Цяпер усе прызнаюць, што совецкі народ сваёй самаадданай барацьбой выратаваў цывілізацыю Еўропы ад фашысцкіх пагромшчыкаў. У гэтым вялікая заслуга совецкага народа перад гісторыяй чалавецтва.

І. В. СТАЛІН.

## ТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ УЗЯТЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПА ЗДАЧЫ БУЛЬБЫ Ў ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

У сваім гістарычным дакладзе ад 6 лістапада 1944 г., т. Сталін заклікае працоўных нашай краіны ўзмацніць дапамогу фронту для хутчэйшага і канчатковага разгрому ворага ў яго ўласнай бярлозе.

Чэсць і слава кожнага совецкага грамадзяніна ўсе сілы аддаць на справу перамогі над нямецка-фашысцкімі івергамі, сваёй упартай напружанай працай штодзённа мацаваць абарончную магутнасць нашай дарагой Радзімы.

Працоўнае сялянства нашага раёна, выканаўшае ўзятае абавязацельства па звышпланавай здачы хлеба, у адказ на даклад тав. Сталіна, распачынае масавую звышпланавую здачу бульбы ў фонд Чырвонай Арміі.

На сходах сельскага актыва, на агульных сходах сялян, адчуваецца небывалы патрыятызм нашых людзей, гатовых усё аддаць ва імя перамогі над ворагам.

— Калі я прачытаў даклад т. Сталіна, — гаворыць селянін в. Зыбайлы Яблонскага сельсовета Ялоўскі Сямён Мартынавіч, — у душы маёй стала столькі радасці, што яе і выказаць нельга. Раз правадыр сказаў, што хутка даб'ём фашысцкага звера — значыць і даб'ём. Толькі мы, сяляне, павінны моцна дапамагаць нашай арміі, Нашу дапамогу фашысцкія разбойнікі адчуюць на сваіх паганых спінах.

У радзе сельсоветаў сяляне ўзялі на сябе большыя абавязацельствы па звышпланавай здачы бульбы, чым гэта было намечана раней.

Здача бульбы ў фонд Чырвонай Арміі — важная кампанія. Яе трэба правесці ў мінімальна сціслыя тэрміны, да наступлення маразоў. А гэта патрабуе вялікай аператыўнасці нашых нарыхтоўчых арганізацый, партыйных, совецкіх органаў і сельскіх советаў.

Трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на прыём бульбы, не дапускаючы, каб яна ляжала пад адкрытым небам. Павінны быць руплівыя гаспадарчыя клопаты ў справе буртоўкі і захавання бульбы.

У сваім дакладзе тав. Сталін сказаў, што цяпер за Чырвонай Арміяй астаецца яе апошняя заключная місія: давяршыць разам з арміямі нашых саюзнікаў справу разгрома нямецка-фашысцкіх армій, дабіць фашысцкага звера ў яго ўласным логаве і ўзняць над Берлінам сцяг перамогі.

Сяляне і сялянкі! Дапаможам нашым воінам дабіць фашысцкага звера! Больш бульбы і другіх прадуктаў ў фонд Чырвонай Арміі!

## ЗАКОНЧЫЛІ АБМАЛОТ

14 лістапада закончан абмалот зернавых у дзяржаўнай гаспадарцы Івацэвічы. Краіне і Чырвонай Арміі здадзена звыш 200 тон хлеба.

У адказ на гістарычны даклад правадыра рабочыя Марцукевіч Павел, Катоўская Владзіслава і другія значна павысілі прадукцыйнасць працы.

У гаспадарцы заканчваюцца ўсе сельскагаспадарчыя работы.

А. Дзем'янчык
М. Данілкевіч

## ПРАЦОЎНЫЯ РАЁНА СПРАВАЙ АДКАЗВАЮЦЬ НА ГІСТАРЫЧНЫ ДАКЛАД Т. СТАЛІНА

### Сяляне Івацэвіч перавыканалі ўзятае абавязацельства

Сход прайшоў бурна. Гутарка ішла аб звышпланавай здачы бульбы ў фонд Чырвонай Арміі. Пасля кароткага даклада старшыні пасялковага совета т. Рэкеш пачаліся спрэчкі.

— Мне 60 год, — заявіў селянін Молаш Андрэй — сын мой на фронце. Не гледзячы на сваю старасць я здаю 20 пудоў бульбы ў фонд нашай любімай Чырвонай Арміі. Няхай мой сын і ўсе воіны нашы ведаюць, што мы ім аказваем штодзённую дапамогу ў хутчэйшым разгроме ворага. Заклікаю аднасяльчан паследаваць майму прыкладу.

На сходзе выступілі многія рабочыя і служачыя, якія таксама рашылі здаць у фонд Чырвонай Арміі па 2—3 пуды бульбы з сваіх прысядзібных участкаў.

Агульны сход прыняў рашэнне: у адказ на даклад правадыра і вялікія перамогі воінаў нашай радзімы, здаць у фонд Чырвонай Арміі 2500 кг. бульбы.

Сход адбыўся 15 лістапада, а 17 лістапада на буртовае поле паступіла 3053 кг. бульбы. Узятае абавязацельства перавыканана. Паступленне бульбы працягваецца.

Т. Остраухава.

## АКУПАНТАМ НЕ ЎДАЛОСЯ ЗЛАМАЦЬ НАШ ДУХ

Да вайны вёска Яблонка налічвала 74 жылых хат і многа другіх пабудоў. У вёсцы была хата-чытальня, магазін. Людзі жылі радасна і шчасліва.

Фашысцкія разбойнікі, прынёсшыя нашаму народу столькі гора і пакут, не мінулі і в. Яблонка. У сакавіку 1944 года вёска была спалена немцамі. З 74 хат асталося толькі 5. 14 чалавек жыхароў былі расстраляны, а 57 больш працаздольных людзей былі ўгнаны на нямецкую катаргу. У вёсцы асталося звыш 16 сіроцкіх сямей.

Фашысты праз увесь час свайго „гаспадарання" помслілі нам за тое, што мы падтрымлівалі партызан. Але ні расстрэламі, ні пажарамі, ні выгнаннем на катаргу ім не ўдалося зламаць наш дух, нашу волю да свабоды і незалежнасці.

Наша вёска нямала дала адважных патрыётаў у рады чырвоных партызан. На кожнае крывавае зладзейства немцаў партызаны адказвалі магутнымі ўдарамі па камунікацыях ворага.

Пераносячы суровыя выпрабаванні нямецкай акупацыі, мы не пакарыліся ворагу, не палі на калені, а змагаліся з ім да апошняй кроплі крыві. І, не гледзячы на ўсе цяжкасці барацьбы, мы вытрывалі, дачакаліся свайго вызвалення і будуем наша новае жыццё ў вялікай сям'і народаў нашай радзімы.

. . . Над краінай прагучэлі мудрыя словы тав. Сталіна. Як радасна жыць у такую эпоху і адчуваць веліч сталінскіх слоў. Яны напаўняюць нашых людзей вялікай свядомасцю і ўпэўненасцю ў нашу перамогу.

Не гледзячы на цяжкасці, мы выканаем усе ўказанні т. Сталіна. Яго мудрыя словы натхняюць нас на новыя ратныя подвігі на фронце працы. Мы акажам Чырвонай Арміі ўсямерную дапамогу ўсім, што толькі нам пад сілу. Выканаўшы ўзятае абавязацельства па здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі, мы таксама не адстанем і па здачы бульбы. Наша дапамога Чырвонай Арміі — гэта бязлітасная помста ворагу за яго крывавыя здзекі, за разбурэнне нашых гарадоў і сёл.

Александр Куленіч, упаўнаважаны сельсовета.

Перавалоцкі Адам, сялянін в. Яблонка, дэлегат абласной нарады сялян.

## У фонд Чырвонай Арміі

Словы даклада тав. Сталіна глыбока запалі ў душу кожнага сялявіна раёна.

Натхнёныя веліччу сталінскіх слоў сяляне распачалі добраахвотную здачу бульбы ў фонд Чырвонай Арміі.

З Грыўдзенскага сельсовета жо паступіла 4156 кг. бульбы, з Стайкаўскага сельсовета—4246 кг. Бульба паступае з Яглевіцкага, Яблонскага, Альшаніцкага і другіх сельсоветаў.

Выканаць узятае абавязацельства чэсць і слава кожнага сялянiна. Гэта трэба зрабіць ў самы кароткі тэрмін.

## Спіртзавод уступіў у строй

Пасля працяглай аднаўленчай работы ўступіў у строй Івацэвіцкі спіртзавод. 16 лістапада адбыўся пробны пуск завода. Праз некалькі дзён завод будзе канчаткова пушчан у ход.

А. Каліна.

## Своечасова забяспечваць хлебам рабочых і служачых

Партыя і совецкая ўлада надаюць вялікае значэнне правільнасці размеркавання прадуктаў харчавання і асабліва зараз, калі наша краіна 4-ты год знаходзіцца ў стане вайны. Для гэтага ўведзена картачная сістэма на перыяд вайны.

Гэта кожнаму зразумела. Мы павінны змагацца за правільнасць расходвання кожнага кілаграма хлеба, мяса і другіх прадуктаў. Адначасова мы павінны забяспечваць адпаведным пайком нашых рабочых і служачых.

Трэба адзначыць, што гандлёвыя арганізацыі Косава яшчэ не паставілі сваю работу належным чынам. У забеспячэнні хлебам рабочых і служачых і да гэтага часу няма ніякага парадку.

Выдаючы хлебныя карткі райторг т. Первушкін усім напамінаў, што хлеб будзе выдавацца ў магазіне гарпо. Аднак у гэтым магазіне хлеб рэдка бывае. Людзі з магазіна ідуць у сталовую, а адтуль іх зноў пасылаюць у магазін. Атрымліваецца нешта падобнае на закалдованы круг.

Такое становішча далей цярпець не магчыма. Мы маем усе магчымасці нармальна забяспечваць рабочых і служачых хлебам. Выканком райсовета дэпутатаў працоўных павінен умяшацца ў гэту справу і навесці большэвіцкі парадак у справе бесперабойнага забеспячэння хлебам рабочых і служачых.

## ВЫДАННЕ ДАКЛАДА І ЗАГАДА Т. СТАЛІНА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Днямі Беларускае Дзяржаўнае выдавецтва выпускае асобнай брашурай на беларускай мове даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша І. В. Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі горада Масквы 6 лістапада 1944 года і Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Советскага Саюза таварыша Сталіна ад 7 лістапада 1944 года.

Тыраж брашуры — 50 тысяч экземпляраў.

Рэдактар А. П. РУДОЙ.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 106